УДК 811.161.3’373.23(476.5)

# Месца рэгіянальных даследаванняў у анамастыцы

**Зайцава К.А.**
***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск***

*Рэгіянальная антрапанімія як асноўны кампанент анамастычных даследаванняў выдзелілася адносна нядаўна і ўжо паспела заняць адну з галоўных пазіцый сярод асноўных падыходаў у вывучэнні антрапаніміі.*

*Мэта артыкула – устанавіць месца рэгіянальных даследаванняў у анамастыцы.*

***Матэрыял і метады.*** *Матэрыялам для даследавання паслужылі працы айчынных і замежных вучоных у вобласці анамастыкі. У якасці метадаў даследавання былі абраны аналітычны і супастаўляльны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Публікацыя пабудавана на вызначэнні месца рэгіянальных даследаванняў у сучаснай анамастыцы. Акрамя рэгіянальнага падыходу прааналізаваны сучасныя аспекты ў вывучэнні онімнай лексікі на аснове прац славянскіх даследчыкаў. У артыкуле даецца дэфініцыя тэрміна антрапанімная рэгіяналістыка, якая характарызуецца спецыфічнай цэласнасцю і займаецца вывучэннем заканамернасцей функцыянавання асобных тыпаў антрапонімаў асобнага рэгіёна ў розных аспектах з улікам храналагічных паказчыкаў. Акрамя таго, робіцца вынік аб тым, што ў развіцці славянскай анамастыцы бачыцца неабходнасць працягу анамастычных даследаванняў з боку поліаспектнага падыходу, што дазволіць усебакова вызначыць асаблівасці фарміравання і функцыянавання анамастычных адзінак.*

***Заключэнне.*** *Антрапонімы даследуюцца як у маштабах усёй краіны, так і на ўзроўні асобных рэгіёнаў. У сучаснай антрапаніміцы рэгіянальны, арэальны аспект вывучэння выходзіць на першы план. Рэгіён, у адрозненне ад тэрыторыі, уяўляе сабой сукупнасць узаемазвязаных з’яў, якія і фарміруюць мяжу рэгіёна. Кожны арэал – гэта самабытная тэрыторыя, якая валодае сацыякультурным кодам. Вывучэнне моўных асаблівасцей асобных рэгіёнаў дазволіць выявіць лінгвістычную спецыфіку агульнай тэрыторыі.*

***Ключавыя словы:*** *антрапанімія, антрапанімная рэгіяналістыка, раяніраванне, рэгіён.*

*(Ученые записки. – 2015. – Том 20. – С. 222–226)*

# Place of Regional Research in Onomastics

**Zaytseva E.A.**
***Educational Establishment «Vitebsk State P.M. Masherov University»***

*Regional anthroponomy as the main constituent of onomastic researches has been singled out not long ago and has taken one of the principal stands among basic approaches in the study of anthroponomy.*

*The purpose of the study is to determine the place of regional researches in onomastics.*

***Material and methods.*** *The material for the research was works on onomastics by national and foreign scientists. Analytical and comparative methods were chosen as the methods of the investigation.*

***Findings and their discussion.*** *The article is built up on determination of the place of regional researches in contemporary onomastics. In addition to regional approach present-day aspects in the study of proper names have been analyzed on the basis of works by Slavonic researchers. The definition of the term of anthroponomical regionalistics, which is characterized by specific integrity and study functioning mechanism of separate types of anthroponyms in separate region from different angles taking into account chronological index, is given in the article. Besides we draw a conclusion that for the development of Slavonic onomastics it is necessary to proceed with onomastic researches using polyaspect approach, which allows defining formation and functioning peculiarities of onomastic units thoroughly.*

***Conclusion.*** *Anthroponyms are examined both on a country and regional scale. In up-to-date onomastics regional aspect of study is put in the forefront. Region, unlike territory, is a system of interconnected phenomena which form region border. Each area is an original territory which possesses social and cultural code. Study of linguistic features of every region will allow determining common linguistic characteristics on common territory.*

***Key words:*** *anthroponomy, anthroponomical regionalistics, zoning, region.*

*(Scientific notes. – 2015. – Vol. 20. – P. 222–226)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* katsyaryna_zaytsava@mail.ru – **К.А. Зайцава**

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў даследаванні ў вобласці анамастыкі вядуцца ў рэчышчы розных напрамкаў: праблем намінацыі (І.А. Гапоненка, С.І. Гасімава, С.В. Глушчык, Т.А. Карніўская, Г.М. Мезенка, Я.Ю. Сідарэнка, Л.Ф. Цімірава), літаратурнай (Г.М. Дзеравяга, М.В. Карпенка, Т.І. Ларына, І.М. Петрачкова, І.Э. Ратнікава, В.В. Шур), прыкладной анамастыкі (А.М. Анісім, І.У. Бародзіч, Т.П. Валынец, Л.П. Калакуцкая, А.І. Копач, В.Э. Сталтманэ, П.У. Сцяцко), сацыялінгвістычным (Р.А. Агеева, С.Д. Алейнікава, Ю.А. Гурская, Г.Ю. Каваленка), рэгіянальным (Р.М. Казлова, І.Л. Капылоў, І.А. Каралёва, Т.Б. Кузняцова, В.П. Лемцюгова, Ю.Ю. Марчанкава, Г.К. Усціновіч) аспектах. Сярод вышэй адзначаных падыходаў рэгіянальная антрапанімія як асноўны кампанент анамастычных даследаванняў у цяперашні час набывае найбольшую актуалізацыю.

Мэта артыкула – вызначыць месца рэгіянальных даследаванняў у анамастыцы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі працы айчынных і замежных вучоных у вобласці анамастыкі. У якасці метадаў даследавання былі абраны аналітычны і супастаўляльны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Сёння ў навуцы ўсё большую актуальнасць набывае вывучэнне моўнай карціны свету і моўнай асобы. Антрапонім – адзін з важных кампанентаў моўнай карціны свету, паколькі з’яўляецца галоўным іменаваннем чалавека і выступае не толькі як носьбіт лінгвістычнай інфармацыі, але і як адлюстраванне культурна-гістарычных традыцый, паколькі вельмі чуйна і дастаткова хутка рэагуе на любыя змены, якія адбываюцца ў соцыуме [1, с. 128]. У сучасных анамастычных даследаваннях антрапонімы сталі разглядацца з пункту погляду адлюстравання этнакультурнай інфармацыі, кагнітыўных мадэляў успрыняцця аб’ектаў прасторы. У працэсе развіцця анамастычнай навукі склаліся асноўныя напрамкі антрапацэнтрычных анамастычных даследаванняў: намінатыўны, лінгвакультуралагічны, лінгвагеаграфічны, псіхалінгвістычны, сацыялінгвістычны, прыкладны.

З боку праблем намінацыі Т.А. Карнiеўская даследуе фарміраванне, функцыянаванне і паходжанне іменаслова Гомеля другой паловы ХХ ст.; украінскі даследчык С.В. Глушчык аналізуе словаўтваральную і марфалагічную структуру ўкраінскай антрапаніміі левабярэжнай Украіны перыяду XVIII ст.; Я.Ю. Сідарэнка на аснове матэрыялу помнікаў дзелавой пісьменнасці г. Табольска падрабязна апісала структурныя мадэлі ўласных імён розных слаёў гараджан, іх варыятыўнасць ва ўтварэнні. Л.Ф. Цімірава ў выніку аналізу онімаў Актанышскага арэала выявіла лексіка-семантычныя асаблівасці антрапонімаў, вызначыла асноўныя структурна-словаўтваральныя мадэлі намінацый. І.А. Гапоненка даследуе праблемы станаўлення старажытнай беларускай іменаслоўнай сістэмы пачатку ХХ ст., у развіцці беларускай антрапаніміі аўтар выдзяляе перыяд беларускага адраджэння, калі ў працэсе фарміравання новай беларускай мовы на жывой народнай аснове беларускі імяннік узяў выразную арыентацыю на нацыянальную самабытнасць [2, с. 47].

Лінгвагеаграфічны аспект вывучэння антрапонімаў прадугледжвае выяўленне фонавых ведаў, што датычацца ўласнага імя, Л.В. Окунева ў сваім дысертацыйным даследаванні, прысвечаным вывучэнню архангельскіх помнікаў дзелавой пісьменнасці, падзяляе дадзеныя крыніцы на паўночныя і паўднёвыя тэрытарыяльныя групы на аснове іх лінгвагеаграфічнай характарыстыкі.

Сацыялінгвістычны аспект прадугледжвае выяўленне асаблівасцей антрапонімаў, з дапамогай якіх выяўляецца сацыякультурная значнасць таго ці іншага арэала. Р.А. Агеева ў навукова-аналітычным аглядзе дала падрабязную сацыялінгвістычную характарыстыку ўласных імён Заходняй Сібіры. І.М. Ганжына адзначае, што ўжо ў XVI ст. у асяроддзі памешчыкаў трохчленная формула пераважае ў як самая звыклая, найбольш кароткая і інфарматыўна ёмістая [3, с. 8].

Праблемамі функцыянавання імя ў грамадстве, матывацыяй выбару ўласнага імя на рэгіянальным узроўні займаецца С.Д. Алейнікава, якая ўстанавіла, што ўласнае імя самым цесным чынам звязана з індывідам, уваходзячы разам з чалавекам у цэнтр яго моўнай свядомасці [4, с. 5].

Рэпрэзентацыяй ведаў аб анамастычных адзінках і перадаваемым імі канцэптуальным змесце займаецца А.С. Шчарбак, якая ў сваёй доктарскай дысертацыі даказвае, што асноўнай задачай лінгвакультуралогіі і этналінгвістыкі з’яўляецца даследаванне і апісанне механізмаў, на аснове якіх

ажыццяўляецца ўзаемадзеянне онімаў як адзінак мовы з семантыкай культурнага кода. Прыхільнікі кагнітыўнага падыходу ў анамастыцы разглядаюць значэнне імя ўласнага “як вынік адлюстравання рэчаіснасці свядомасцю чалавека” (І.С. Карабулатава). Кагнітыўная функцыя анамастычных з’яў, на думку М.В. Галамідавай, праяўляецца ва ўдзеле ўласных імён у працэсе мысленчай дзейнасці чалавека і ў магчымасці захоўваць веды як асабіста моўныя, так і энцыклапедычныя [цыт. па 5].

Праблемы прыкладной анамастыкі застаюцца актуальнымі як у беларускім, так і ў рускім мовазнаўстве (А.В. Супяранская, А.У. Суслава, Л.П. Калакуцкая, В.Э. Сталтманэ), паколькі назіраецца варыянтнасць граматычных формаў антрапонімаў. На пасяджэнні “круглага стала” “Праблемы стандартызацыі нацыянальнай анамастыкі” на канферэнцыі “Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць” (2010 г., г. Мінск) айчыннымі вучонымі (А.М. Анісімам, І.У. Бародзіч, А.І. Копачам) былі абмеркаваны пытанні правапісу беларускіх прозвішчаў [6]. Акрамя таго пытаннямі скланення і ўжывання беларускіх прозвішчаў займаюцца Т.П. Валынец, П.У. Сцяцко. Праблемы станаўлення нормаў беларускай літаратурнай мовы XIX – пачатку XX ст. у галіне графікі, арфаграфіі, лексікі даследуе І.А. Гапоненка, у сваёй доктарскай дысертацыі аўтар разглядае “станаўленне нацыянальных онімных формаў”. Спосабы перадачы беларускіх імён па-руску, чэшскіх, славацкіх па-беларуску адлюстраваны ў працах Г.Н. Клюсава, І.І. Лучыца-Федарца. Даследаванне пытанняў перакладу і скланення прозвішчаў сёння застаецца асабліва актуальным і патрабуе ўвагі лінгвістаў.

Аналізуючы анамастычныя даследаванні апошніх гадоў можна заўважыць значную колькасць прац, у якіх онімы разглядаюцца поліаспектна. М.Ю. Бяляевай быў зроблены комплексны аналіз анамастыкону заходніх раёнаў Краснадарскага краю. Аўтар падкрэслівае, што полісістэмнасць рэгіянальнага анамастыкону вызначаецца яго прыналежнасцю да прасторы мовы [7, с. 30]. А.В. Шаўлякоў займаўся вывучэннем антрапонімаў рускага паўночнага арэала з боку семантычнага, функцыянальнага, лексікаграфічнага падыходаў. Поліаспектны падыход прымяняўся С.І. Гасімавай, якая прапанавала шматбаковую класіфікацыю татарскіх адапелятыўных антрапонімаў. К.А. Андрэевай упершыню зроблена спроба комлекснага аналізу ўласнага імя пры маўленчых зносінах. Г.Ю. Каваленка разгледзіла ўласныя імёны на матэрыяле пскоўскай дзелавой пісьменнасці ў сацыялінгвістычным аспекце.

На сучасным этапе развіцця навукі актывізавалася ўвага да рэгіянальных даследаванняў амаль ва ўсіх сферах: палітыцы, філасофіі, гісторыі, у тым ліку і лінгвістыцы. Рэгіяналістыка – інтэгральная навука, якая адлюстроўвае сінтэз розных навук у падыходзе да рэгіянальных даследаванняў. Арэальныя даследаванні прадугледжваюць вывучэнне асобных заканамернасцей вызначанай галіны не толькі паміж абласцямі розных краін, але і паміж сельскімі, раённымі і абласнымі рэгіёнамі ў межах адной краіны. Кожны рэгіён – гэта асобная тэрыторыя, якая адрозніваецца і выдзяляецца сукупнасцю гістарычных, эканамічных, палітычных і нацыянальных асаблівасцей.

У свеце ўрбанізацыі актуальным прадстаўляецца вывучэнне і фіксацыя анамастычных адзінак кожнага рэгіёна, і яшчэ большай каштоўнасцю з’яўляецца палявы метад збору інфармацыі. Аналіз антрапанімікону асобнай тэрыторыі дазволіць выявіць асаблівасці, якія характэрны для ўсёй сістэмы мовы ў цэлым, а таксама дасць магчымасць вызначыць лінгвістычную спецыфіку даследуемага рэгіёна. Н.В. Бубнава сцвярждае, што рэгіянальныя онімы па прычыне сваёй непасрэднай блізкасці да ўспрымаемага суб’екта могуць мець нават большае значэнне для фарміравання канкрэтнай моўнай асобы, чым уласныя імёны больш высокіх узроўняў [8].

На погляд прафесара У.А. Дзергачова, рэгіяналістыка – гэта навука аб цэласных тэрытарыяльных аб’яднаннях, якія валодаюць цывілізацыйным (сацыякультурным) кодам на макрарэгіянальным, рэгіянальным і субрэгіянальным узроўнях [9]. А.Г. Ісачанка прытрымліваецца думкі, што рэгіяналістыка павінна ўключаць такія кірункі, як раяністыка (распрацоўка агульных прынцыпаў і метадаў сістэматызацыі шляхам раяніравання), рэгіёназнаўства (вывучэнне спецыфікі развіцця рэгіёнаў у шматлікіх аспектах – ад прыродных да этнаканфесійных) і інш. [10]. Рэгіяналістыка можа разглядацца як “макрадысцыпліна, якая аперыруе

абагульненымі, кантрольнымі вынікамі ў рамках галіновых прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін”. Па словах У.М. Стралецкага, у такой інтэрпрэтацыі рэгіяналістыка выступае ў ролі звязуючага звяна, якое аб’ядноўвае самыя розныя напрамкі рэгіянальных даследаванняў [11, с. 3]. Н.У. Падольская таксама вызначае асобна тэрмін “рэгіянальная анамастыка” [12, с. 103]. Акрамя таго аўтар выдзяляе яшчэ адно паняцце, звязанае з папярэднім, – анамастычны арэал – вобласць распаўсюджання аднаго анамастычнага факта або з’явы, якая была ўстаноўлена ў выніку анамастычнага даследавання дадзенай тэрыторыі [12, с. 101]. Вызначыўшы асноўныя прыкметы рэгіяналістыкі як навукі, можна даць дэфініцыю тэрміну ў дачыненні да антрапаніміі. *Антрапанімная* рэгіяналістыка – накірунак у сістэме анамастычных даследаванняў, які характарызуецца спецыфічнай цэласнасцю і займаецца вывучэннем заканамернасцей функцыянавання асобных тыпаў антрапонімаў канкрэтнага рэгіёна ў розных аспектах з улікам храналагічных паказчыкаў. Антрапанімнае рэгіянальнае даследаванне не можа прэтэндаваць на глыбіню і дакладнасць вывучэння без уліку гістарычнай састаўляючай рэгіёна. У.М. Стралецкі ўказвае, што паколькі адзінства рэгіёна мысліцца як агульнасць людзей, то пры такім даследаванні рэгіёна проста немагчыма абысціся без уліку фактару гістарычнай спадчыны. “Тэрытарыяльныя супольнасці людзей – катэгорыі, якія развіваюцца не проста зменліва, але і перманентна, і не выпадкова, што адно з самых распаўсюджаных паняццяў у рэгіяналістыцы – гэта паняцце хранатопа (прастора + час). Часавая дамінанта ў рэгіянальным аналізе не менш важная, чым прасторавая” [11, с. 4]. Вызначальныя рысы любога рэгіёна наўпрост залежаць не толькі ад яго сучаснага, але і ад мінулага.

Даволі актыўна філалагічная рэгіяналістыка развіваецца ў Расіі і Беларусі. Яшчэ ў пачатку XX ст. былі закладзены асновы рэгіянальнай антрапаніміі ў працы М.М. Тупікова “Слоўнік старажытнарускіх уласных асабовых імён” (“Словарь древнерусских личных имен”), дзе на аснове фактычнага матэрыялу аўтар устанавіў арэалы бытавання канкрэтных антрапанімных асноў.

Рэгіянальная антрапаніміка як асобны накірунак мае сваю методыку даследавання асобных арэалаў. Асаблівасці арэальных анамастычных даследаванняў базіруюцца на аснове прац і методык беларускіх вучоных. Г.М. Мезенка даследуе антрапанімікон Віцебшчыны ад XVII ст. і да сучаснасці, паходжаннем імён, прозвішчаў і мянушак на Віцебшчыне займаюцца В.М. Ляшкевіч, Г.К. Семянькова. Імяннік беларускага пагранічча (тэрыторыя Браслаўскага, Верхнядзвінскага, Расонскага, Мёрскага, Лёзненскага раёнаў) даследуе Ю.М. Галкоўская. Цэнтральныя раёны Віцебшчыны застаюцца маладаследаванымі. На тэрыторыі Брэстчыны і Гродзеншчыны пытанням паходжання антрапонімаў, іх скланення, словаўтварэння прысвяцілі свае працы Т.М. Аліферчык, С.Ф. Бут-Гусаім, З.І. Макаранка, І.А. Шумская і Г.К. Усціновіч. А.А. Лукашанец у публікацыях “Лакальная сістэмы ўласных асабовых імён” і “Родавыя (спадчынныя) найменні ў сістэме мясцовага антрапанімікону” разглядае сістэму традыцыйных беларускіх уласных асабовых імён адной з вёсак цэнтральнага раёна Міншчыны.

Новым кірункам у вывучэнні анамастыкі з’яўляецца пытанне анамастычнай лексікаграфіі. Гэтай галіной актыўна займаецца С.У. Шахоўская, якая распрацавала тыпалогію онімных слоўнікаў з улікам аб’екта лексікаграфічнага апісання і спецыфікі іх структуры, вызначыла асноўныя вектары развіцця сучаснай анамастычнай лексікаграфіі Беларусі.

Актуалізацыю рэгіянальнага ракурсу анамастычнай навукі пацвердзілі рэгіянальныя канферэнцыі “Анамастыка ў Смаленску і Віцебску” (г. Смаленск, 17–18 сакавіка 2015 г.), “Ономастика Поволжья” (першая канферэнцыя адбылася ў 1967 г.), часопіс “Филологическая регионалистика”.

У гэтым рэчышчы працуюць буйныя анамастычныя школы цэнтральных раёнаў Расіі – Растоў-на-Доне (Л.М. Шчацінін), Волагда (І.Ю. Чайкіна, С.М. Смольнікаў), Перм (А.М. Палякова, Т.А. Сіроткіна), Урал (А.П. Беразовіч, М.Э. Рут), Смаленск (Н.В. Бубнава, І.В. Данілава, І.А. Каралёва, М.В. Салаўёў), Казань (Г.Ф. Сатараў) і інш. Актыўна займаюцца анамастычнымі даследаваннямі лабараторыя рэгіянальнай анамастыкі ў Рэспубліцы Адыгея (Р.Ю. Намітокава) і навуковая школа рэгіянальнай анамастыкі ў Рэспубліцы Бурацыя (Л.В. Шулунова). Значны ўклад у развіццё рэгіянальнай украінскай анамастыкі

ўнеслі прадстаўнікі Данецкай анамастычнай школы пад кіраўніцтвам прафесара Я.С. Оціна: Г.П. Лукаш, Я.В. Філатава. Рэгіянальная антрапанімія Украіны стала аб’ектам даследавання такіх вучоных, як А.Я. Бучко, М.А. Дзямчук, І.М. Жалязняк, П.П. Чучка, Л.М. Верхавых. Ля вытокаў латышскай анамастычнай навукі стаяла В. Дамбэ, анамастычныя ідэі прафесара распрацоўваюцца яе паслядоўнікамі А. Бушасам, П. Балодзісам, літоўскімі даследчыкамі Г. Блажэнай, А. Клявінскай.

Уласным імёнам рэгіянальнай лакацыі ў Польшчы прысвечаны працы З. Абрамовіч, І. Мытнік (антрапанімія польска-украінскага паграніччa), К. Рымут, С. Роспанд, Я. Баўко, М. Койдар, М. Малец.

**Заключэнне.** Антрапонімы даследуюцца як у маштабах усёй краіны, так і на ўзроўні асобных рэгіёнаў. У сучаснай антрапаніміцы рэгіянальны аспект вывучэння выходзіць на першы план. Рэгіён уяўляе сабой сукупнасць узаемазвязаных з’яў, якія і фарміруюць мяжу рэгіёна. Кожны арэал – гэта самабытная тэрыторыя, якая валодае сацыякультурным кодам. Вывучэнне моўных асаблівасцей асобных рэгіёнаў дазволіць выявіць лінгвістычную спецыфіку агульнай тэрыторыі.

*Работа выканана пры фінансавай падтрымцы БРФФД (праект № Г14М-103 ад 23.05.2014 г.).*

## Літаратура


1. Королева, И.А. Именники приграничных регионов: проблемы и перспективы исследования / И.А. Королева // Смоленская ономастика (к 1150-летию со дня основания города Смоленска). Статьи разных лет. – Смоленск: Маджента, 2012. – 220 с.
2. Гапоненка, І.А. Беларускі іменаслоў перыяду першага беларускага адраджэння. Аўтарскія подпісы і псеўданімы / І.А. Гапоненка // Роднае слова. – 2002. – № 4. – С. 45–47.
3. Ганжина, И.М. Тверская антропонимия XVI в. в социально-историческом и лингвистическом аспектах: (на материале тверских писцовых книг): автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 / И.М. Ганжина; Тверской гос. ун-т. – Тверь, 1992. – 20 с.
4. Олейникова, С.Д. Ономастическое пространство г. Моршанска: социальный аспект: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 / С.Д. Олейникова; Тамбовский гос. ун-т имени Г.Р. Державина. – Тамбов, 2007. – 23 с.
5. Щербак, А.С. Когнитивные основы региональной ономастики: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.19, 10.02.01 / А.С. Щербак; Тамбовский гос. ун-т имени Г.Р. Державина. – Тамбов, 2008. – 46 с.
6. Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 20 крас. 2010 г. / Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2010. – 314 с.
7. Беляева, М.Ю. Ономастикон западных регионов Краснодарского края: полисистемный аспект: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01 / М.Ю. Беляева; Ставропольский гос. ун-т. – Ставрополь, 2010. – 37 с.
8. Бубнова, Н.В. Имена собственные в структуре региональных фоновых знаний смолян: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 / Н.В. Бубнова; Смол. гос. ун-т. – Смоленск, 2011. – 23 с.
9. Дергачев, В.А. Регионалистика [Электронный ресурс] / В.А. Дергачев. – Режим доступа: http://dergachev.ru/book-7/00.html. – Дата доступа: 25.08.2015.
10. Регионалистика [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Регионалистика. – Дата доступа: 07.09.2015.
11. Стрелецкий, В.Н. Историческая география и регионалистика: пути и перспективы взаимодействия / В.Н. Стрелецкий // Псковский регионологический журнал. – 2007. – № 5. – С. 3–13.
12. Подольская, Н.В. Словарь русской ономастической терминологии / Н.В. Подольская. – 2-е изд., перераб. и доп. – М., 1988. – 192 с.


*Паступіў ў рэдакцыю 04.11.2015 г.*